Высшим воплощением красоты для Ф. М. Достоевского является Христос. Именно образ Христа, воплотившего в Себе земное страдание и его духовное преодоление, становится для писателя обещанием осуществления будущей гармонии, столь невозможной в настоящем, сколь фантастичным и нереальным кажется в нем приход и само существование Спасителя. Вера же эта в будущую гармонию, царство вечной жизни и красоты не сразу пришла к нему. В последней записной книге писатель признавался: «Не как мальчик же я верую во Христа и Его исповедую, а через большое горнило сомнений осанна моя прошла».

Ф. М. Достоевский не был богословом и ученым академического склада. Его тонкая проницательность в отношении человеческой души и прозрение грядущего мирового кризиса выдают в нем скорее пророка, предупреждающего людей о близком возмездии, зовущего к покаянию и отвращению от зла. Единственной силой, способной, по мнению писателя, спасти человечество от неминуемой гибели, является сила Христова. В Личности Христа – совершенном Человеке – Достоевскому открылась Истина, Красота и Добро. Во всей мировой литературе еще не было создано образа Христа, равного по силе тому, который был создан Ф. М. Достоевским в «Легенде о Великом инквизиторе» (роман «Братья Карамазовы»).

Ф. М. Достоевский был абсолютно уверен, что только полное освобождение человека от греха может принести покой человеческой душе, алчущей мира и счастья. Понимание следования за Христом Ф. М. Достоевский выразил устами любимого героя – Алеши Карамазова: «Не могу я отдать вместо всего два рубля, а вместо «иди за Мной» ходить лишь к обедне» [Ф. М. Достоевский. Братья Карамазовы].

**А. М. Палуян**
(Гомель)

## Літаратурнае краязнаўства: Дастаеўскі і Беларусь

Курс "Літаратурнае краязнаўства" разам з іншымі дысцыплінамі філалагічнага цыкла ўваходзіць у блок прадметаў, мэтай якіх з'яўляецца падрыхтоўка высокакваліфікаваных настаўнікаў-славеснікаў.

Літаратурнае краязнаўства – гэта форма актыўнага дзейснага пазнання Радзімы, яе гісторыі, культуры, таму яно цесна звязан з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

такімі прадметамі, як “Сусветны літаратурны працэс”, “Гісторыя беларускай літаратуры”, “Гісторыя Беларусі”. У выніку вывучэння дысцыпліны студэнты пазнаёмяцца з найважнейшымі літаратурнымі мясцінамі ўсіх рэгіёнаў Беларусі; паглыбяць веды пра спецыфіку дзейнасці краязнаўчых і літаратуразнаўчых музеяў Рэспублікі Беларусь; выпрацуюць навыкі практычнай дзейнасці ў галіне літаратурнага краязнаўства.

Сярод асноўных метадаў літаратурнага краязнаўства – экскурсіі па памятных мясцінах, пошук матэрыялаў у архівах, музеях і бібліятэках, а сярод крыніц літаратура-краязнаўчага матэрыялу – шматлікія энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі, манаграфіі і нарысы, прысвечаныя пэўнаму перыяду жыцця і творчасці мастакоў слова.

Адна з такіх мясцін на Брэстчыне звязана з гісторыяй роду пісьменніка Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага. У 1506 годзе частка вёскі Дастоева была падаравана пінскім князем Фёдарам Яраслававічам Данілу Янавічу (І)Рцішчаву, два сыны якога – Іван і Сямён – пасяліліся ў Дастоеве і ўзялі прозвішча Даст**о**еўскія. У сярэдзіне XVII стагоддзя, падчас паўстання Багдана Хмяльніцкага, фальварак быў фактычна разбураны, уладальнікі не змаглі заплаціць падаткі і былі вымушаны ратавацца ўцёкамі. Знайшлі прытулак на Украіне, на Валыні, дзе пражылі яшчэ тры стагоддзі. Бацькам вядомага рускага пісьменніка быў Міхаіл Андрэевіч Дастаеўскі, адзін з сыноў протаіярэя горада Брацлава Падольскай губерні, які пераехаў туды з Дастоева. Міхаіл Андрэевіч скончыў Маскоўскую медыка-хірургічную акадэмію, стаў штаб-лекарам Мар’інскай бальніцы для бедных у Маскве.

Такім чынам гісторыя роду Дастаеўскіх звязвае тры народы – беларусаў, украінцаў і рускіх. Род бярэ пачатак у беларускай вёсцы Дастоева, бацька пісьменніка з украінскай вёскі Вайтоўцы, а жыццё і творчасць Фёдара Міхайлавіча звязаны з Масквой і Пецярбургам.

Сярэдняя школа і вуліца ў Дастоеве носяць імя Фёдара Дастаеўскага. У школе створаны літаратурна-краязнаўчы музей, большая частка экспазіцыі якога − матэрыялы пра жыццё і творчасць пісьменніка, дакументы пра гісторыю роду Дастаеўскіх. У 2006 г. праўнук пісьменніка Дзмітрый Дастаеўскі наведаў Дастоева і падарыў музею радавое дрэва і дэкаратыўную талерку з выявай вёскі і родавым гербам “Радван”. Вёсцы і школьнаму музею прысвечана апавяданне і эсэ Івана Мележа “Дастоева”, вершы Аляксея Зарыцкага “Рэпартаж з Дастоева”, Васіля Макарэвіча “Дастоева”, Яўгеніі Янішчыц “Па дарозе ў Дастоева”.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ